## Вясёлая восеньская вандроўка

Восем верных вандроўнікаў: Вера, Валянціна, Віктар, Вольга, Вераніка, Васіліна, Віталік, Валерый – вучні-васьмікласнікі. Вера, Віктар, Вераніка выдатна вучацца. Валянціна, Віталік – веласіпедысты. Вольга, Васіліна, Валерый – выдатныя валейбалісты.

Вандроўкі выхоўваюць вынослівасць, вытрымку. Вучыць васьмікласнікаў вандраваць Вішнеўская Вікторыя Вацлаваўна. Выхавацельніца вырашыла выпрабаваць вучняў. Васямнаццатага верасня васьмікласнікі выйшлі вандраваць вакол Віцебскай вобласці. Выхавацельніцу Вікторыю Вацлаваўну вучні віншавалі валошкамі. Выкладчыца Вікторыя Вацлаваўна важна вымавіла: “Вітаю вас, вандроўнікі!” Вёска Ваўкалата выцягнулася вакол выгінастага вірлівага возера Вулькаўскае. Вакол ветраная, вільготная восень. Выхавацельніца, вучні выйшлі вузкай выкашанай вуліцай Верасковай. Ваколіца вітала вясёлых вандроўнікаў. Варожа выглядалі вясковыя вароны.

Вось высокі вал. Вунь высіцца высачэзны вячысты вяз. Вяз-волат – векавы вартаўнік. Вітнулася вершаліна, выскачыла вавёрка.

– Ваў! Вавёрка – вострае вока – вітае вас! – выдала Вераніка.

– Ведаеце? Восенню вые воўк! – важна выкрыкнуў Віталік.

– Вунь вуж выглянуў, – вымавіла выхавацельніца Вікторыя Вацлаваўна.

Вандроўнікі выйшлі вязнікам. Вільгаццю веяў восеньскі вецер вакол вірлівага вадаёма. Ветліва вітала восень вандроўнікаў.

Выдатна! Восень, восень!

Вадроўнікі весела выкрыквалі вядомыя восеньскія выразы, весяліліся.

Вабіла возера.

– Вунь выспа! – выкрыкнула Вольга.

– Востраў вартуе ваколіцу вадаёма, – вырашылі вандроўнікі.

Вынырнула выдра. Вучні войкнулі. Варожа віруе вадаварот. Відаць водбліск вечара. Вяршынямі выплылі воблакі. Вясною вернуцца вадаплаваючыя.

Вечарэла. Вярталіся вучні-вандроўнікі вядомай ваколіцай. Вакол вёскі Ваўкалата высока віўся восеньскі вінаград. Вераб΄і вычырыквалі вячоркі верхавінам вішань.

Вечарам вандроўнікі вячэралі вяндлінай, варэнікамі, выпечкай, вішнёвым варэннем. Валянціна вышывала валошкі, Валерык вырабляў васкавыя вырабы, вершы выразна вымаўляла Вераніка. Выдатны выдаўся вечар васямнаццатага верасня.

– Вывад? – вымавіла Вікторыя Вацлаваўна.

– Вымыць, выпрасаваць вопратку, вандраваць! – выкрыкнулі вучні. Выпрабаванне вучні-вандроўнікі вытрымалі: вопыт вялізны.

Выдалася вясёлая восеньская вандроўка. Вось!

***Баранчук Улада Анатольеўна,***
вучаніца IX класа ДУА «Сярэдняя школа № 7
г. Гродна»